УДК 94(476):331.108

# НЕПРАВАМЕРНЫЯ ДЗЕЯННІ НЕПАЎНАЛЕТНІХ УСХОДНІХ РЭГІЁНАЎ БССР У 1970-Я ГГ. (НА ПРЫКЛАДЗЕ ГОРАДА ОРШЫ)

**І. А. Пушкін**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій,
дацэнт кафедры гуманітарных дысцыплін,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

***Аннотация.*** *У артыкуле на прыкладзе горада Оршы — буйнога прамысловага цэнтра ўсходняй часткі Савецкай Беларусі — раскрыты неправамерныя дзеянні непаўналетніх у 1970-я гг. Зроблена выснова, што, нягледзячы на меры, прынятыя праваахоўнымі структурамі, прасочвалася тэндэнцыя не да скарачэнн, а да павялічвання колькасці правапарушэнняў непаўналетніх.*

***Ключевые слова:*** *Савецкая Беларусь, БССР, горад Орша, непаўналетнія, злачыннасць, неправамерныя дзеянні, ахова правапарадку.*

***Annotation.*** *The article, using the example of the city of Orsha, a large industrial center in the eastern part of Soviet Belarus, reveals the illegal actions of underages in the 1970s. It is concluded that, despite the measures taken by law enforcement agencies, there was a tendency not to reduce, but to increase the number of offenses committed by underages.*

***Keywords:*** *Soviet Belarus, BSSR, city of Orsha, underage, crime, illegal actions, law enforcement.*

Наша мэта — прааналізаваць неправамерныя дзеянні непаўналетніх усходнебеларускіх рэгіёнаў БССР на прыкладзе буйнога прамысловага цэнтра — горада Оршы ў 1970-я гг. — перыяд згортвання ліберальна-дэмакратычных рэформ у СССР. Злачынныя дзеянні непаўналетніх у савецкай краіне разглядаліся шэрагам даследчыкаў на мінулым і сучасным этапах развіцця грамадства [1; 2; 3; 4; 5; 6; 7; 8]. Але сітуацыя ў БССР у поўным аб'ёме не раскрыта, што і абумоўлівае актуальнасць даследавання. Гістарычны кантэкст патрэбны для лепшага разумення прававой культуры непаўналетніх у савецкі час і барацьбы з падлеткавай злачыннасцю ў пераходны постсавецкі перыяд, а таксама ў сучаснай Беларусі.

Працэсы канцэнтрацыі насельніцтва ў гарадах прыводзілі да ўзрастання злачыннасці. Асабліва небяспечнай была сітуацыя ў прамысловых цэнтрах: Бабруйску, Віцебску, Гомелі, Магілёве, Наваполацку, Оршы, Полацку і інш. Так, напрыклад, у гарадах Оршы і Барані ў 1971 г. было зарэгістравана 243 злачынствы, за наступны год — 279. Раскрываемасць складала адпаведна 92,6 % і 95,7 %. Колькасць цяжкіх злачынстваў павялічыліся з 136 да 177.

Назіраўся рост рабаванняў, крадзяжоў дзяржаўнай маёмасці і асабістай уласнасці. У 1972 г. прыцягнулі да крымінальнай адказнасці 264 чалавекі, з іх непаўналетніх — 38 [9, арк. 28–29]. Насцярожвала падлеткавая злачыннасць сярод школьнікаў, яе вага ў 1971 г. па Магілёве склала 21,3 %, Бабруйску — 29,7 % ад агульнай колькасці злачынстваў, здзейсненых непаўналетнімі [10, арк. 27]. Не памяншалася колькасць згвалтаванняў, наўмысных цяжкіх цялесных пашкоджанняў, фактаў хуліганства і ў наступныя гады. У Віцебскай вобласці за 1975 г. па лініі крымінальнага вышуку зафіксавалі 2 137 злачынстваў, за 9 месяцаў 1976 г. — 2 159. З іх 309 здзейснены непаўналетнімі: у Полацку — 22, Наваполацку — 10, Віцебску — 67 і інш. [11, арк. 54].

На працягу 1970-х гг. стабільна павялічвалася злачыннасць сярод непаўналетніх у гарадах Оршы і Барані. У 1971 г. яны здзейснілі 31 злачынства, 1972 г. — 40, 1974 г. — 56, 1975 г. — 59. Камісія па справах непаўналетніх толькі ў 1975 г. разгледзіла 80 спраў на 122 падлеткі, што было больш, чым у 1974 г. Не лепшым становішча было і ў 1976 г. Толькі за першы квартал года непаўналетнія здзейснілі 11 уліковых злачынстваў па лініі крымінальнага вышуку — больш, чым за адпаведны перыяд папярэдняга года. Удзельная вага злачыннасці непаўналетніх у 1974 г. складала 11,2 % да ўсёй злачыннасці ў горадзе Оршы, у 1975 г. — 12,6 %. Па відах злачынстваў выглядала наступным чынам: згвалтаванні ў 1974 г. — 5, у 1975 г. — 3; рабаванне — адпаведна 6 і 3; цяжкія цялесныя пашкоджанні — 2 і 3; крадзеж дзяржмаёмасці — 9 і 7; крадзеж асабістай уласнасці — 17 і 11; хуліганства — 16 і 21; угон аўтатранспарту — 0 і 4; збыт наркатычных рэчываў — 0 і 1; супраціўленне работнікам міліцыі — 0 і 4; наўмысныя лёгкія цялесныя пашкоджанні — 0 і 1. Рост колькасці непаўналетніх злачынцаў у 1975 г. адбыўся галоўным чынам за кошт навучэнцаў агульнаадукацыйных школ (з 16 у 1974 г. да 25 у 1975 г.) і навучэнцаў ПТВ (адпаведна з 6 да 14). Наогул з 63 падлеткаў, якія ўчынілі злачынствы ў 1975 г., 42, або 66,6 %, з'яўляліся навучэнцамі школ, гарадскіх ПТВ і сярэдніх спецыяльных устаноў адукацыі [12, арк. 124–125]. Сітуацыя істотна не змянілася і ў першай палове 1980-х гг. Так, аналізуючы ўзровень злачыннасці сярод непаўналетніх горада Оршы, органы выканаўчай улады адзначалі, што падлеткамі ў 1984 г. было здзейснена на 22 % больш крымінальных злачынстваў, чым ў 1983 г. [13, арк. 20].

Аналіз неправамерных дзеянняў непаўналетніх паказвае, што 50 % усіх злачынстваў яны здзейснілі ў нецвярозым стане. Вельмі часта п'янства з'яўлялася непасрэдным штуршком да злачынства, найперш хуліганства. У 1975 г. непаўналетнімі Оршы і Барані быў здзейснены 21 выпадак хуліганства, якія пацягнулі за сабой крымінальнае пакаранне. Калі ў 1974 г. вучні

агульнаадукацыйных школ за п'янства і дробнае хуліганства не мелі прывадаў у міліцыю, то ў 1975 г. іх было 9. За падобныя правапарушэнні прыцягнулі да адказнасці 46 навучэнцаў ПТВ. За п'янства і дробнае хуліганства дастаўляліся ў медвыцвярэзнік і аддзел унутраных спраў непаўналетнія, якія працавалі на прамысловых прадпрыемствах: на заводах «Легмаш» — 17 чалавек, «Чырвоны барацьбіт» — 6, інструментальным — 5, ільнокамбінаце — 11 [12, арк. 128–129, 136]. Здзейснілі 18 крымінальных злачынстваў падлеткі, якія працавалі на заводах «Легмаш», «Чырвоны Кастрычнік» і трактарарамонтным па 3, ільнокамбінаце — 4. Узрасла колькасць неправамерных дзеянняў з боку членаў УЛКСМ: дробнае хуліганства — з 35 чалавек да 98 (амаль у 3 разы), п'янства — з 69 да 106. Толькі за 1975 г. прыцягнулі да крымінальнай адказнасці 29 камсамольцаў, 30 дастаўляліся ў медыцынскі выцвярэзнік. За студзень – сакавік 1976 г. адміністрацыйна пакаралі 117 членаў УЛКСМ, 18 даставілі ў медвыцвярэзнік, супраць 16 камсамольцаў былі ўзбуджаны крымінальныя справы [12, арк. 135].

Савецкае грамадства вельмі хвалявала падлеткавая злачыннасць. У БССР рашэннямі выканкамаў гарадскіх саветаў дэпутатаў былі зацверджаны «Правілы паводзін дзяцей і падлеткаў у гарадах». Гэтымі Правіламі было вызначана, што дзецям да 16 гадоў забаранялася наведваць тэатры, кіно і іншыя відовішчныя мерапрыемствы пасля 20:00 гадзін і знаходзіцца на вуліцы без суправаджэння бацькоў або асоб, якія іх замяшчаюць, пасля 22:00. Правілы пасля іх прыняцця выдаваліся спецыяльнай лістоўкай і рассылаліся літаральна па ўсіх адрасатах горада, публікаваліся на старонках мясцовых газет, агучваліся па радыё [12, арк. 142].

Безумоўна, асноўны цяжар барацьбы са злачыннасцю неслі праваахоўныя органы. Асабісты склад аддзелаў унутраных спраў абл- і гарвыканкамаў рабіў пэўную працу па ўмацаванні правапарадку і сацыялістычнай законнасці ў гарадах усходу Беларусі. Вялікая ўвага надавалася правядзенню мерапрыемстваў па прадухіленні правапарушэнняў, выкарыстоўваліся сродкі масавай інфармацыі і прапаганды па растлумачэнні савецкіх законаў і нарматыўных актаў. Напрыклад, у 1972 г. у аршанскай раённай газеце «Ленінскі прызыў» было апублікавана 17 матэрыялаў па пытаннях аховы сацыялістычнай уласнасці, аб барацьбе з п'янствам і алкагалізмам, па мясцовым радыёвяшчанні на тэмы аховы грамадскага парадку зроблена 11 выступленняў, аператыўна-начальніцкім складам РАУС праведзена 537 выступленняў перад работнікамі прадпрыемстваў і арганізацый.

У прамысловых цэнтрах Віцебскай, Гомельскай і Магілёўскай абласцей ажыццяўляліся розныя прафілактычныя мерапрыемствы. Так, у адпаведнасці з планам правядзення аперацыі «Сям'я» правяраліся сем'і, у якіх складваліся

ненармальныя ўзаемаадносіны. Прымаліся меры ўздзеяння: афіцыйныя засцярогі і папярэджанні, індывідуальныя гутаркі, устанаўлівалася шэфства, чыталіся лекцыі і даклады. З удзелам членаў добраахвотных народных дружын і іншых грамадскіх арганізацый 2–3 разы на месяц праводзіліся рэйды па выяўленні безнаглядных падлеткаў, дапускаўшых розныя парушэнні грамадскага парадку. Для ліквідацыі прычын і ўмоў, якія спрыялі правапарушэнням, кіраўнікам прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый было ўнесена 117 прадстаўленняў, накіравалі 937 паведамленняў аб антыграмадскіх паводзінах асобных грамадзян, перасцярогі атрымалі 305 правапарушальнікаў [9, арк. 24]. У прамысловых прадпрыемствах і ўстановах выкарыстоўваліся агітацыя, тлумачэнні, прапаганда здаровага ладу жыцця і розныя меры адміністрацыйнага ўздзеяння: пазбаўленне прэміі, перанос чаргі на атрыманне кватэры на 50 чалавек, перавод на ніжэй аплочваемую працу, заробак выдавалі праз асобнае акно касы са спецыяльнай рэкламаю (Асіповіцкі кардоннаруберойдавы завод і інш.) [14, арк. 382].

Дзіцячыя пакоі міліцыі і камісіі па справах непаўналетніх неаднаразова запрашалі на свае пасяджэнні кіраўніцтва прадпрыемстваў і прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый, дзе абмяркоўваліся неправамерныя дзеянні непаўналетніх, ставілі у вядомасць кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўстаноў аб ухіленні бацькоў ад выканання сваіх абавязкаў у выхаванні дзяцей, накіроўвалі адпаведныя лісты для абмеркавання іх у калектывах. Але часцяком на іх або зусім не рэагавалі, або адказвалі фармальнымі адпіскамі. Між тым сярод гэтай кагорты бацькоў былі тыя, хто самі працавалі кіраўнікамі на вытворчасці і з’яўляліся выхавальнікамі. Напрыклад, у горадзе Оршы сярод іх былі начальнік аддзела забеспячэння камбіната сілікатных вырабаў, завуч школы, майстар змены завода ЖБВ «Сельбуд», выхавальнік дзіцячага сада-ясляў № 23 і іншыя [12, арк. 134].

Тагачаснае партыйна-савецкае кіраўніцтва Савецкай Беларусі асноўнай прычынай такога становішча лічыла неэфектыўнае ажыццяўленне прафілактычных мерапрыемстваў. Сур’ёзныя прэтэнзіі прад’яўляліся да навучальных і клубных устаноў наконт арганізацыі работы з «цяжкімі» падлеткамі. Але сітуацыя не палепшылася і ў наступнае дзесяцігоддзе.

Такім чынам, на прыкладзе горада Оршы Віцебскай вобласці можна зрабіць выснову, што ў 1970-я гг. урбанізацыя, сацыяльна-эканамічныя праблемы ў буйных прамысловых цэнтрах стварылі ўмовы, пры якіх павялічвалася колькасць неправамерных дзеянняў з боку непаўналетніх, тых, хто станавіўся на шлях здзяйснення злачынстваў і правапарушэнняў. Сярод іх былі школьнікі, навучэнцы ПТВ і працуючыя. У выніку прымаемых мер праваахоўнымі структурамі і грамадствам перыядычна ўмацоўвалася законнасць, паляпшаўся грамадскі парадак. Але нягледзячы на гэта, было даволі шмат цяжкіх злачынстваў,

а па некаторых з іх, такіх як рабаванні, крадзяжы дзяржаўнай маёмасці і асабістай уласнасці грамадзян, злосныя хуліганствы, адбываўся рост, у тым ліку злачынстваў, учыненых непаўналетнімі.


1. Ветров Н. И. Проблемы изучения состояния, динамики и структуры преступности и безнадзорности среди несовершеннолетних // Тез. докл. и сообщ. межведомств. науч.-практ. конф. М., 1970. С. 4–5. Вернуться к статье

2. Горшенева Н. А., Миньковский Г. М. Борьба с преступностью несовершеннолетних в больших городах. М. : Изд-во Всесоюз. ин-та по изучению причин и разработке мер предупреждения преступности, 1975. 82 с. Вернуться к статье

3. Краснов Д. А. Преступность несовершеннолетних в РСФСР в 1975–1979 гг. на этапе свертывания реформ // «Черные дыры» в Российском законодательстве. 2013. № 6. С. 39–53. Вернуться к статье

4. Краснов Д. А. Характеристика преступности несовершеннолетних и системы борьбы с подростковой преступностью в РСФСР за 1970–1974 гг. (свертывание либерально-демократических реформ) // Пробелы в Российском законодательстве. 2013. № 5. С. 54–69. Вернуться к статье

5. Миньковский Г. М. Актуальные проблемы борьбы с преступностью несовершеннолетних // Совершенствование деятельности органов внутренних дел по укреплению социалистической законности и правопорядка в стране на современном этапе. Пленарные заседания : материалы Всесоюз. науч. конф., 6–8 окт. 1970 г. Вып. 1. М. : НИиРИО ВШ МВД СССР, 1971. С. 107–120. Вернуться к статье

6. Полякова Н. И. Система предупреждения преступности несовершеннолетних: история и современность. М. : Юрлитинформ, 2010. 184 с. Вернуться к статье

7. Преступность несовершеннолетних в республиках бывшего СССР (1966–1989 гг.) : статистич. сб. / сост.: Ермаков В. Д., Иванова А. А., Попова Н. П. М. : МАКС Пресс, 2006. 180 с. Вернуться к статье

8. Пушкін І. А., Агееў А. Р. Кадравы патэнцыял прамысловасці ўсходніх рэгіёнаў БССР (1944–1991) : манагр. Магілёў : БДУТ, 2022. 302 с. Вернуться к статье

9. Докладная записка о состоянии общественного порядка и борьбы с преступностью и результатах деятельности ОВД Оршанского горисполкома за 1972 г. // Занальны дзяржаўны архіў г. Орша (ЗДАОрш). Ф. 27. Воп. 6а. Спр. 88. Вернуться к статье

10. Представление Прокуратуры Могилевской области от 4.02.1971 г. // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднанняў Магілёўскай вобласці. Ф. 9. Воп. 147. Спр. 81. Вернуться к статье

11. Сведения о состоянии преступности и охраны общественного порядка за 9 месяцев 1976 г. // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф. 1966. Воп. 14. Спр. 176. Вернуться к статье

12. Протокол шестой сессии Оршанского городского Совета народных депутатов от 22.04.1976 г. // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 457. Вернуться к статье

13. Протокол первой сессии Оршанского городского Совета народных депутатов от 01.03.1985 г. // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 454. Вернуться к статье

14. Информационная записка об организационно-массовой работе исполкома Осиповичского городского совета депутатов за 1973 год // Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 2223. Вернуться к статье